# СВАБОДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА №122, 10-16.7.2008 г.

# ЦЭРБЕР САРВАЎСЯ З ЛАНЦУГА

## ВЫБУХ НА “ПРАЗЬНІКУ” БЫЎ ПАД СТАЦЬ “ПРАЗЬНІКУ”

Улада і дзяржаўныя СМІ так незвычайна шмат увагі надаюць начному выбуху каля стэлы “Мінск – горад-герой”, што, здаецца, для таго той выбух і прагрымеў, каб толькі пра яго й гаварыць. На пытанне “Каму гэта выгадна?” знаходзяцца дзясяткі адказаў, якія застаюцца домысламі, бо гульні, якія вядзе Аляксандр Лукашэнка пад дыванком як у краіне, так і за яе межамі, настолькі таемныя для грамадскасці, што даставерная тлумачэння знайсці папросту немагчыма. У незалежнага аналітыка ў арсенале застаюцца паралелі з ранейшымі падобнымі здарэннямі (абстрэл мерседэса пад Лёзнам, выбухі ў Віцебску, выкраданне палітычных апанентаў рэжыму), з самім характарам пустога па-сутнасці мілітарна-папсовага “празьніка”, які не мае нічога агульнага з традыцыямі, гісторыяй і ментальнасцю беларускай нацыі, затое ўсёй сваёй эстэтыкай нагадвае муляж выбуховага прыстасавання, як, зрэшты, і ўся палітыка цяперашняга кіраўніка краіны, які то рогі абяцае абламаць старшыню аблвыканкаму, то заклікае да “жастачайшых” мер, то прапануе народу яшчэ адну пяцігодку “адмучыцца”.

Згадзіцеся, за 15 гадоў такой рыторыкі магло вырасці цэлае пакаленне “жастачайшых абломшчыкаў рогаў”, бяздумных і неміласэрных. І вось тут пытанне, на якое адказаць можна й тады, калі не ведаеш усіх таямніц уладных закулісных гульняў: дзе ў беларускім грамадстве хаваюцца тыя, кажучы словамі Лукашэнкі, гніды, якія здольныя на такі ўчынак (не важна, з чыёй падачы або замовы – гэтага мы можам не даведацца ніколі). Наша грамадства нядрэнна ведае само сябе і някепска праглядаецца. Яно традыцыйна зусім не крыважэрнае і аддае перавагу прынцыпу “не высоўвайся”. І калі ў ім з’яўляюцца людзі, што гатовыя публічна ўзарваць і скалечыць пяць дзясяткаў суграмадзян (прычыны, паўтаруся, нам невядомыя), дык гэтыя асяродкі павінны быць бачныя і ўжо не раз “засвяціць” сябе ў падобных злачынствах.

Такія асяродкі ў Беларусі ёсць. Гэта прарасійскія нэафашысты і нацболы, якія шмат гадоў учыняюць акты вандалізму ў Курапатах, малююць свастыкі на мемарыяле Яма, на дзвярах сядзібаў БНФ і ТБМ. Улада глядзіць на іх выхадкі скрозь пальцы, бо бачыць у іх ланцуговых цэрбераў уласнага рэжыму.

*(Заканчэнне на стар.5)*



**СЛЯДЫ КРЫВІ** *на месцы выбуху блізу стэлы “Мінск— Горад-герой”, на скрыжаванні праспектаў Пераможцаў і Машэрава. Дзясяткі людзей былі паранены падчас святочнага канцэрту гайкамі і балтамі, якімі было начынена выбуховае прыстасаванне. Як стала вядома, яшчэ за дзве гадзіны да тэракту міліцыя знайшла яшчэ адно такое прыстасаванне ў 2-х літровым пакеце з-пад соку – ўдвая большае за тое, што выбухнула. Але эвакуацыя людзей не пачалася ні да, ні пасля выбуху. Мінск, 4 ліпеня 2008 году.*

## ЯКІЯ СІЛЫ Ў БЕЛАРУСІ ПРЫНОСЯЦЬ НАЙБОЛЕЙ ШКОДЫ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЕ?

АПЫТАННЕ НА СТАР.2

## СКАЖЫ ДУРНЮ МАЛІЦЦА...

ЭСЭ АЛЕГА АБЛАЖЭЯ НА СТАР.7

# ЯКІЯ СІЛЫ Ў БЕЛАРУСІ ПРЫНОСЯЦЬ НАЙБОЛЕЙ ШКОДЫ НАШАЙ ДЗЯРЖАВЕ?

**ВОЛЬГА, НАСТАЎНІЦА:**

## "МЫ САМІ ПРЫНОСІМ ШКОДУ СВАЁЙ ДЗЯРЖАВЕ"

Мы самі прыносім найболей шкоды сваёй дзяржаве. Сваёй пасіўнасцю і абыякавасцю. Нас не хвалююць ні мова, ні гісторыя, ні літаратура, ні будучыня. Наша хата заўсёды з краю. І калі-небудзь пры такім стаўленні да сваёй хаты, яе, хату, у нас адбяруць.

**СЯРГЕЙ КАЛЯКІН, ЛІДЭР ПКБ:**

## "НАЙБОЛЬШАЯ ШКОДА АД СІСТЭМЫ, СТВОРАНАЙ У КРАІНЕ"

Не магу адказаць адназначна. Ёсць такія сілы і людзі ва ўладзе. Я думаю, не ўсе дзеянні палітычных партыяў на карысць дзяржаве. Я б не казаў так, што ёсць нейкія сілы зла і сілы святла. На жаль, сёння найбольш шкоды мы атрымліваем ад дзеянняў улады. Яны маюць найбольшы ўплыў на грамадства і краіну. Найбольшая шкода ад самой сістэмы, якая створана ў краіне. Сістэма бюракратычная, пры якой усе працуюць па пранцыпе "я начальнік, ты дурань". І людзі працуюць не дзеля справы, а дзеля таго, каб было задаволенае начальства. І мала хто можа гэтаму парадку пярэчыць. А дзеянні апазіцыі, яны не прыносяць такой шкоды, бо апазіцыя не мае інструментаў, якія дазваляюць ажыццяўляць нейкія намеры і задумкі.

**ВІКТАР, МУЗЫКА:**

## "ІМПЕРСКІЯ СІЛЫ ЎНУТРЫ БЕЛАРУСІ"

Найбольшую шкоду ўяўляюць імперскія расійскія сілы ўнутры Беларусі. Усе гэтыя РНЕшнікі, нацболы і проста людзі, якія жывуць у расійскім тэлевізары і купаюцца ў расійскай папсе. Плошча падчас матчу Расія-Іспанія гэта выразна прадэманстравала. Калі Расія настолькі стала нашай, дык хутка Беларусі будзе мала месца на карце свету.

**АЛЯКСАНДР КЛАСКОЎСКІ, АНАЛІТЫК:**

## "АСАБЛІВАСЦІ БЕЛАРУСКАГА МЕНТАЛІТЭТУ"

Калі браць пакручасты шлях развіцця беларусаў, то недахоп ёсць працягам вартасцяў. Я б казаў пра нейкія ментальныя сілы, асаблівасці беларускага менталітэту. Цяжкая гісторыя Беларусі выпрацавала абачлівасць, псіхалогію, калі лічаць, што лепей верабей у руцэ, чым жораў у небе. Аднак, канечне, у пэўных сітуацыях гэтая абачлівасць дазваляе прымаць больш узважаныя рашэнні. У той беларускай стабільнасці, з якой часам кпяць, ёсць станоўчы бок. У тым сэнсе, што беларусы не спяшаюцца з нейкай ломкай, з непрадуманымі рашэннямі. А з іншага боку, менавіта гэты прынцып вераб'я ў руцэ падводзіць беларусаў. Таму, што прайшло 16 гадоў, а краіна па-ранейшаму на гістарычным раздарожжы. І тут не варта толькі ў гарод улады кідаць камяні. Бо, калі грамадства ў большыні сваёй было б настроена іначай, то ніякая ўлада не змагла б цягам гэтых гадоў трымаць сітуацыю пад каўпаком, у шчыльна накрытым накрыўкай катле. Гэтыя ментальныя комплексы беларусаў і замаруджваюць сёння гістарычнае прасоўванне нацыі наперад.

**ВАСІЛЬ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## "АБЫЯКАВЫЯ ЛЮДЗІ"

Я не ведаю, як разумее дзяржаву большасць яе грамадзянаў, але маёй дзяржаве найбольшую шкоду прыносяць людзі абыякавыя. А ў якія яны ўжо кансалідуюцца інстытуцыі... Гэта вынік гэтай абыякавасці. Але ж найбольшую шкоду прыносіць абыякавасць да будучыні сваіх дзяцей, да ўласнай гісторыі, да свайго нацыянальнага гонару, да сваёй мовы і культуры. А яшчэ адсутнасць мары. І нават неабыякавасць, якую я не магу падзяліць, мне больш сімпатычная, чым абыякавасць.

**АНДРЭЙ САННІКАЎ, "ХАРТЫЯ'97":**

## "УЛАДА ЁСЦЬ ДЭСТРУКТЫЎНАЙ СІЛАЙ"

Калі мець на ўвазе менавіта беларускую дзяржаву, відавочна, што найбольш ёй шкодзяць улады. Таму што знішчаецца гісторыя, культура. Улада ёсць той дэструктыўнай сілай, якая не паважае ні культурную, ні моўную, ні гістарычную спадчыну беларускага народу. А гэта, на мой погляд, ёсць найбольш шкодным.

**СЯРГЕЙ, ПЕНСІЯНЕР:**

## "БРСМ, РПЦ І СПЕЦНАЗ"

Хто больш за ўсіх знішчае нацыянальную ідэнтычнасць беларусаў? Наш кіраўнік. І ўся ягоная ідэалагічная вертыкаль разам з БРСМ, РПЦ і спецназам. Зайдзіце ў любы праваслаўны храм у Беларусі. Дзе там прысутнасць хоць якой беларушчыны? Паліцы поўныя імперскіх кніжак пра "смуту 1612-га", пра Мікалая II, пра Пятра I. Чым займаецца БРСМ? Выхоўвае моладзь у страху і рабалепстве. І паспрабуйце загаварыць з якім спецназаўцам на мове продкаў. Дай Бог Вам здароўя пасля той размовы!

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "НАЙБОЛЬШУЮ ШКОДУ РОБІМ МЫ"

Найбольшую шкоду нашай дзяржаве робім мы, яе грамадзяне. Рэч тут вось у чым. Мы, беларусы, недзяржаўны народ. Прынамсі, пакуль. Прычынай таму адсутнасць у нашай гісторыі, а значыць у нашым ментальным досведзе, сваёй уласнай дзяржавы. Дзяржава для нас – гэта не тая ці іншая сістэма ўлады, якая над намі пануе. Не ўласны дом, які атуляе ад злыбяды. І нават цяпер, калі беларусы нарэшце прыдбалі ўласную дзяржаву, яны яе ўспрымаюць толькі як чарговую форму ўлады над сабой. Пэўна, многія памятаюць знакамітую фразу з расійскага фільма "Белае сонца пустыні": "за державу обидно". Дык вось. Нават самыя лепшыя з беларусаў яшчэ не навучыліся мысліць маштабамі дзяржавы. Найбольш выразны прыклад тут – нацыянальныя эліты. Іх турбуюць праблемы нацыянальнай незалежнасці Беларусі, нацыі, чаго заўгодна яшчэ, але не дзяржавы як такой. Выглядае на тое, што пакуль у нашай краіне толькі адзін чалавек ужо адчуў і зразумеў дзяржаву як каштоўнасць. І то, хіба, толькі таму, што гэта яго прыватная каштоўнасць.

# ЗЛАМАНАЯ КАРУСЕЛЬ

## ВОСЬМАЯ ГАДАВІНА ЗНІКНЕННЯ ЗМІТРА ЗАВАДСКАГА — ВЫБУХ НА ПРАСПЕКЦЕ ПЕРАМОЖЦАЎ — ЛУКАШЭНКА ЗНЯЎ З ПАСАДАЎ НЯВЫГЛАСА І ШЭЙМАНА — ФАШЫСТЫ Ў ГОМЕЛІ РАСПЕРАЗАЛІСЯ — ТЭРАРЫСТАЎ ШУКАЮЦЬ СЯРОД АПАЗІЦЫЯНЕРАЎ — АВАРЫЯ Ў ПАРКУ ЧАЛЮСКІНЦАЎ

Хацелася пачаць агляд падзеяў тыдня **7-м ліпеня**. У гэты дзень нарадзіўся **Янка Купала**. Але гэтым разам да магілы вялікага паэта на Вайсковых могілках у Мінску прыйшлі ўсяго некалькі пісьменнікаў, усклалі кветкі, прадстаўнік міністэрства культуры прачытаў па паперцы афіцыйны тэкст, і на гэтым свята паэзіі скончылася.

7 ліпеня, аднак, увайшло ў найноўшую гісторыю Беларусі тым, што ў гэты дзень, у 2000-м годзе, каля мінскага аэрапорту знік тэлеаператар **Зміцер Завадскі**. Выкраданне і забойства людзей – гэта з арсеналу тэрарыстаў ва ўсім свеце. Пра іх найперш давялося ўспомніць на гэтым тыдні. Як і пра сам тэрарызм, якога ў "стабільнай Беларусі", нібыта, не было і не магло быць. Праўда, да гэтага былі іншыя зніклыя, былі выбухі ў Віцебску ў 2005-м…

Уначы на **4-га ліпеня**, падчас святочнага канцэрту, на які прыйшлі дзясяткі тысяч гледачоў, выбухам самаробнай бомбы **параніла звыш 50-ці чалавек**. Некаторыя з іх дагэтуль застаюцца ў бальніцах. Кіраўнік дзяржавы, як і яго паплечнікі, якія былі ў той момант на трыбуне для ганаровых гасцей, не пацярпелі. У выніку са сваіх пасадаў указам Аляксандра Лукашэнкі былі знятыя (у сувязі з пераводам на іншую працу) кіраўнік адміністрацыі прэзідэнта **Генадзь Нявыглас** (на здымку злева) і дзяржсакратар Рады бяспекі РБ **Віктар Шэйман**.



Між тым, напярэдадні дзяржаўнага свята, **2 ліпеня** фашысты справакавалі масавую бойку **ў Гомелі**. Як піша БелаПАН, у беспарадках удзельнічалі каля 60 чалавек. На рок-музыкаў, якія вярталіся з канцэрту, напалі сябры незарэгістраванай арганізацыі **РНА** (Расійскае нацыянальнае адзінства), узброеныя палкамі і бітамі. Адзін з удзельнікаў канцэрту быў паранены нажом у грудзі і дастаўлены ў рэанімацыю. Нападнік быў затрыманы на месцы здарэння. Гэта жыхар Гомеля, 1988 году нараджэння.

Няма сведчанняў, што сябры РНА альбо нацболы маюць дачыненне да выбуху ў Мінску. (Міліцыя, як паведамляецца, мае паўтара дзясятка версіяў злачынства). Але характэрна, што не фашыстаў, а беларускую дэмакратычную апазіцыю прэзідэнцкая "Советская Белоруссия" **5 ліпеня** абвінавеціла ў адказнасці за стварэнне атмасферы нянавісці ў краіне (гл. стар. 6).

Тэма выбуху неяк незаўважна пераплялася з тэмай парламенцкіх выбараў, якія Лукашэнка яшчэ нядаўна абяцаў зрабіць паказальнымі для ўсёй Еўропы. (Дарэчы, інтэрв'ю з ім у "Камсамолцы" выйшла акурат **3 ліпеня**).

**6 ліпеня** адбыўся **ператрус** на кватэры дэмакратычнага **актывіста** ў Пінску, прайшлі допыты актывістаў, а таксама незалежных журналістаў у **Чэрыкаве, Клімавічах, Іўі.** Усіх дапытвалі ў справе выбуху ў сталіцы. Аналагічныя допыты прайшлі ў многіх гарадах Беларусі, і амаль ва ўсіх выпадках яны тычыліся тых, хто так ці йнакш меўся ўдзельнічаць у восеньскай выбарчай кампаніі.

**7-га ліпеня** пяці салігорскім актывістам, сярод якіх – **Іван Шыла**, выключаны сёлета са школы падчас выпускных іспытаў, патэлефанавалі з міліцыі і папрасілі даць тлумачэнне, дзе яны былі ў ноч на 4 ліпеня.



**ПАРАД ФІЗКУЛЬТУРНІКАЎ** *пачас святкавання Дня Рэспублікі, Мінск, праспект Пераможцаў, 3 ліпеня 2008 году.*

**8 ліпеня** супрацоўнікі КДБ правяліператрус у Мінску, у кватэры адной з кіраўнічак згуртавання беларусаў свету "Бацькаўшчына" **Ніны Шыдлоўскай.** (Падчас прэзідэнцкіх выбараў яна кіравала прэсслужбай кандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна.) Яе муж **Міраслаў Лазоўскі** ў той самы дзень быў затрыманы і дапытаны КДБ.

Увечары таго ж дня быў затрыманы ў сябе на дачы пад Мінскам 34-гадовы **Ігар Корсак**. Як паведаміла Радыё Свабода, супрацоўнікі КДБ падчасператрусу знайшлі пакет з гайкамі і балтамі ды гумовыя пальчаткі. Пазней стала вядома, што 7-га быў арыштаваны яшчэ адзін падазраваны – былы лідэр незарэгістраванай арганізацыі "Белы Легіён" **Сяржук Чыслаў**...

Скончыць давядзецца тым, што бяда не прыходзіць адна.

**7 ліпеня** (зноў гэтая магічная лічба!) **у Парку чалюскінцаў у Мінску** зламалася старая карусель, на якой каталіся дзеці і дарослыя. **Пацярпелі 6 чалавек**, адзін з іх – цяжка.

**А. УЛАСАЎ**



**ЗЛАМАНАЯ КАРУСЕЛЬ**. *Супрацоўнік міліцыі аглядае месца аварыі на адным з атракцыёнаў у парку Чалюскінцаў, Мінск, 7 ліпеня 2008 году.*

# НІ КРОКУ НАПЕРАД, НІ КРОКУ НАЗАД

## ЦІ ЁСЦЬ ШАНЕЦ У АПАЗІЦЫІ НА СЁЛЕТНІХ ВЫБАРАХ?

*(У мінулым нумары мы пісалі пра расклад асноўных палітычных сіл Беларусі перад парламенцкімі выбарамі ў краіне, якія маюць адбыцца 28 верасня гэтага году. І паабяцалі, што раскажам пра тое, якія шанцы ёсць у апазіцыі.)*

Апошнія 13 гадоў адна з асноўных задач дэмакратычных сілаў падчас падобных кампаніяў — прапагандаваць свае погляды, інфармаваць беларускае грамадства пра сапраўдны стан справаў у краіне.

Такая ж мэта, выглядае, ставіцца і цяпер. "Павелічэнне колькасці прыхільнікаў зменаў, пашырэнне электаральнага плацдарму — гэта тое, што стаіць на парадку дня, — публічна прызнаецца старшыня Аб'яднанай грамадзянскай партыі (АГП) Анатоль Лябедзька. — За кошт гэтага мы зможам пашырыць плацдарм тых, хто нас падтрымлівае (цвёрдых прыхільнікаў зменаў каля чвэрці насельніцтва). Калі пасля кампаніі ў нашым лагеры іх стане на 10—15 адсоткаў больш, гэта будзе значыць, што папрацавалі няблага".

### СТРАТЭГІІ Ў АДСУТНАСЦІ ГРАМАДСТВА

Дык ці з'явяцца гэтыя дадатковыя адсоткі?

Ужо сёння можна адназначна сказаць, што не.

Днямі Навуковы інстытут сацыяльна-эканамічных і палітычных даследаванняў (НІСЭПД, Вільня) падвёў вынікі свайго чарговага нацыянальнага апытання. На пытанне "Ці дастатковы ў Вас доступ да інфармацыі аб падрыхтоўцы да будучых парламенцкіх выбараў?" 63 адсоткі адказалі станоўча! І толькі 36 адсоткаў прызналіся, што не маюць такога доступу. Нагадаем, што ў 2001 годзе падчас больш важнай палітычнай кампаніі – прэзідэнцкай – 68 адсоткам апытаных не хапала інфармацыі аб праграмах і поглядах асноўных удзельнікаў барацьбы за вышэйшую пасаду ў краіне.

... Шмат вады ўцякло з таго часу. Сёння наўрад ці хто стане аспрэчваць той факт, што Інтэрнэт у нашай краіне развіваецца хуткімі тэмпамі. А ў сусветным сеціве цяпер можна адшукаць патрэбныя рэсурсы, прычым даволі нядрэннай якасці.

Апошняе апытанне нашых суайчыннікаў паказала, што беларусы дастаткова інфармаваныя (у тым ліку і пра дзеянні апазіцыі), але пры гэтым яны не жадаюць станавіцца пад апазіцыйныя сцягі. Паводле іншых вынікаў таго ж даследавання, прыхільнікаў апанентаў рэжыму налічваецца ўсё тыя ж 25 адсоткаў...

Палітолаг **Сяргей Нікалюк** лічыць, што ў беларускім грамадстве амаль нічога не змянілася за апошнія 15 гадоў:

*— Калі б наша апазіцыя была моцнай, то за тыя ж 15 гадоў яна павінна была павялічыць колькасць сваіх прыхільнікаў хоць на некалькі пунктаў. Але гэтага не адбываецца. Акрамя ўсім вядомых аб'ектыўных фактараў (пастаянны ціск уладаў, вельмі абмежаваная інфармацыйная прастора, штодзённая маштабная агітацыйная апрацоўка нашых грамадзянаў і г.д.) існуюць і суб'ектыўныя.*

*Па-першае, пастаянныя "разборкі", што вядуцца ўнутры апазіцыйных колаў на тэму "Хто цар гары на сённяшні момант?" не дадаюць ім вагі і аўтарытэту. Па-другое, асобныя лідэры апазіцыі не ўяўляюць, на якім сацыяльным полі яны працуюць. З'яўляюцца стратэгіі, дзе беларускае грамадства адсутнічае ўвогуле! Пра сістэмную работу нашай апазіцыі і гаварыць няма чаго: усё зводзіцца да пэўнай актывізацыі дзеянняў падчас чарговай палітычнай кампаніі.*

Цяжка не пагадзіцца са спадаром Нікалюком. Надзвычай важную сацыяльную кампанію, прысвечаную адмене льготаў для асобных катэгорый грамадзянаў, апазіцыя ўжо прайграла (па сутнасці, нават не паспела яе распачаць).

Да дня галасавання засталося ўсяго два з паловай месяцы. Але пакуль ні лістовак, ні праграмаў кандыдатаў у дэпутаты, ні якіх-небудзь акцый, прысвечаных ужо распачатай палітычнай кампаніі, не бачна.

Між тым, намеснік старшыні Беларускага народнага фронту (БНФ) **Віктар Івашкевіч** лічыць, што набраць дадатковыя 10—15 адсоткаў прыхільнікаў зменаў цягам парламенцкай кампаніі цалкам рэальна:

*— Гэта магчыма, асабліва ў буйных гарадах – такіх, як Мінск, Гродна, Брэст, дзе ментальнасць выбаршчыкаў больш "прасунутая", чым у сярэднім у краіне. Мы разумеем, што шмат людзей сёння не цікавяцца палітыкай. Ментальнасць змяніць вельма цяжка... Наша задача — падштурхнуць прыхільнікаў зменаў да ўсведамлення таго, што ніхто, акрамя іх саміх, не "вылепіць" лепшую будучыню для Беларусі.*

### ДЫМАВАЯ ЗАСЛОНА І СПАДЗЕВЫ НА ПЛОШЧУ

Магчыма, рашэнне кіраўніка дзяржавы аб уключэнні ў склад участковых выбарчых камісій прадстаўнікоў апазіцыі прывядзе да большай празрыстасці выбараў і (як вынік) да з'яўлення цэлай групы дэмакратаў у парламенце?

**Віктар Івашкевіч** перакананы, што і гэта магчыма:

*— Мы бачым, што частка прадстаўнікоў рэжыму захацела весці дыялог з апазіцыяй. Яны разумеюць, што далей так жыць нельга. А ва ўсе часы (прыгадаем хаця б падзеі 1988 году ў Польшчы ці ў СССР у 1985—1987 гадах) рэжым мяняўся, калі частка яго прыхільнікаў імкнулася да зменаў. Калі прадстаўнікі апазіцыі насамрэч будуць дапушчаны ў склад выбарчых камісіяў, то мы рэальна зможам прэтэндаваць на дастаткова вялікую прысутнасць дэмакратаў у будучым парламенце.*

**Апытанне паказала, што беларусы дастаткова інфармаваныя (у тым ліку і пра дзеянні апазіцыі), але пры гэтым яны не жадаюць станавіцца пад апазіцыйныя сцягі. Паводле іншых вынікаў таго ж даследавання, прыхільнікаў апанентаў рэжыму налічваецца ўсё тыя ж 25 адсоткаў...**

Старшыня Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) **Аляксандр Ярашук** упэўнены, што нічога карыснага з абвешчанай уладамі лібералізацыі выбарчага працэсу не атрымаецца:

*— Улады зацікаўлены толькі ў тым, каб надаць гэтым выбарам найбольшую легітымнасць, якой потым можна будзе размахваць, як жупелам, на Усходзе і асабліва на Захадзе, у адносінах з якім назапасілася шмат праблемаў і непаразуменняў. У парламент, напэўна, пройдуць некалькі чалавек ад апазіцыі, але, на мой погляд, гэта будуць далёка не самыя знакавыя і папулярныя асобы, якія ў стане вырашаць сур'ёзныя пытанні.*

*(Заканчэнне на стар.5)*

# ЦЭРБЕР САРВАЎСЯ З ЛАНЦУГА

## ВЫБУХ НА “ПРАЗЬНІКУ” БЫЎ ПАД СТАЦЬ “ПРАЗЬНІКУ”

*(Заканчэнне. Пачатак на стар.1)*

Вось прыйдзе час, і можна будзе нацкаваць іх на сваіх ідэйных праціўнікаў – ці то патрыётаў, што дамагаюцца роўных правоў для беларускай мовы, ці то “зялёных”, што пратэстуюць супраць будаўніцтва АЭС. Ваяваць з іншадумцамі з дапамогай ланцуговых цэрбераў, вядома, не надта прыгожа, але заўсёды ёсць магчымасць паказаць чыстыя рукі ды спаслацца на “малойчыкаў”. Сёлета ўлада настолькі загулялася з нацболамі, што тыя заявілі пра свой намер удзельнічаць у выбарах у парламент...

Аднак, не будзем збівацца ў хадзе нашых разваг на домыслы. Давайце шукаць злачынцаў з іншага боку лагічнага ланцужка. Хто вакол нас здольны безаглядна і бяздумна калечыць людзей выбухоўкай ды іншымі спосабамі? “Скіны”, “фашыкі”, “нацболы”... Пакуль іх у беларускім грамадстве няшмат. Значна шырэй прадстаўленыя ланцуговыя цэрберы ў суседняй Расіі, адкуль яны разам з адпаведнай “ідэалогіяй” трапляюць і да нас. І тут, на вялікі жаль, знаходзяць для сябе пажыўнае асяроддзе мілітарна-папсовага гламуру. Іх колькасць расце, яны непазбежна выходзяць з-пад кантролю ўлады, якая ўсё яшчэ думае, што цалкам іх кантралюе. Але раз-пораз цэрбер зрываецца з ланцуга.

**СЫМОН МУЗЫКА**




**РАБОЧЫЯ МАЗа** *на мітынгу з выпадку тэракта ў расійскім Беслане, Мінск, верасень 2006 году. Фота з архіву.*

# Выбары

*(Заканчэнне. Пачатак на стар.4)*

*Асабіста я ў гатоўнасць да зменаў асобнай часткі чыноўнікаў не надта веру. Гэтая сацыяльная катэгорыя запалоханая, яна дрыжыць ад страху за ўласныя пасады і сваю свабоду.*

Сябра Палітрады АГП **Анатоль Паўлаў** працаваў міжнародным назіральнікам у Саратаўскай губерні на выбарах у Дзярждуму РФ у 2002 годзе:

*— Нават у Расійскай Федэрацыі захоўваюцца ўсе фармальнасці падчас выбараў любога ўзроўню, у тым ліку і думскіх. Усе партыі праз сваіх прадстаўнікоў могуць уваходзіць у склад выбарчых камісіяў любога ўзроўню і ўдзельнічаць у адкрытым падліку галасоў. Мы павінны дамагацца такога ж фармату правядзення любых выбараў у сябе. Праўда, па маім перакананні, нашы ўлады наўрад ці калі на гэта пойдуць.*

Некаторыя лідэры апазіцыі шмат спадзеваў падчас гэтай кампаніі звязваюць з Кастрычніцкай плошчай, куды яны збіраюцца заклікаць прыхільнікаў змен і сумленных выбараў 27 верасня — напярэдадні галасавання. Наколькі апраўданы такія надзеі?

**Сяргей Нікалюк** лічыць, што сур’ёзных падстаў для гэтага не існуе:

— *Паводле вынікаў шматлікіх сацыялагічных апытанняў, нашы падаткаплатнікі выбар свайго лёсу звязваюць толькі з прэзідэнцкімі выбарамі. Парламент па сваім значэнні і ўплыве ў свядомасці беларусаў ацэньваецца даволі нізка. Таму паўтарэння сцэнарыя “намётавага гарадка-2006” не адбудзецца хаця б з гэтай прычыны.*

*Да таго ж, апаненты рэжыму сёння не маюць ні дастатковай папулярнасці, ні матэрыяльных рэсурсаў, ні інтэлектуальных напрацовак для арганізацыі прыканцы гэтага году сур’ёзнай вулічнай кампаніі.*

**Віктар Івашкевіч** настроены не так песімістычна:

*— Усе дэмакратычныя сілы — і тыя, хто ўдзельнічае ў выбарах, і тыя, хто іх байкатуе, — салідарныя ў тым, што трэба заклікаць народ на Кастрычніцкую плошчу 27 верасня. Ці збярэцца там дастаткова людзей? Мы будзем усяляк даводзіць да свядомасці нашых грамадзянаў, што “на халяву” свабоды і дэмакратыі не бывае — за іх трэба змагацца.*

**ГЕНАДЗЬ БЕРТАШ**

**P.S.**

Зразумела, нельга не задацца пытаннем – ці адаб’ецца на выбарчай кампаніі выбух на праспекце Пераможцаў? І калі так, дык якім чынам?

Усе мае суразмоўцы ў адзін голас выказвалі думку, што наступствы выбуху не будуць значнымі. Намеснік старшыні БНФ Віктар Івашкевіч лічыць: “трагедыя 4 ліпеня – гэта ўдар па незалежнасці краіны, а за яе выступаюць як улады, так і яе апаненты”. Таму, на ягоную думку, нічога не павінна змяніцца ў сцэнарах правядзення восеньскіх выбараў як з боку ўлады, так і апазіцыі. Палітолаг Сяргей Нікалюк падзяляе гэтае меркаванне: “Апазіцыі няма ніякага сэнсу выклікаць агонь на сябе напярэдадні важнай палітычнай кампаніі, а ўладам трэба паказаць перад заходнікамі, якія яны “мяккія і пушыстыя”. Старшыня БКДП Аляксандр Ярашук наўпрост называе здарэнне ў цэнтры Мінска тэрактам, але пры гэтым мяркуе, што на будучых выбарах ён адаб’ецца толькі ўскосна: “Не думаю, што гэта моцна паўплывае на цяперашнюю парламенцкую кампанію, але цяпер ужо ясна, што ўмовы яе правядзення наўрад ці палепшацца”. Сябра Палітрады АГП Анатоль Паўлаў лічыць, што ўладам трэба вельмі сур’ёзна прааналізаваць ступень палярызацыі нашага грамадства. Праўда, ён не думае, што выбух прывядзе да арыштаў прадстаўнікоў апазіцыі ці нейкіх іншых скрайніх мер: “Навошта сабе забяспечваць нейкі дадатковы картбланш на гэту гульню, калі яе вынікі ўжо спланаваныя?”

Што ж, засталося не так многа часу, как пабачыць, ці спраўдзяцца гэтыя прагнозы.

**Г.Б.**

Саюздрук

# СВЯТА Ў КОЖНЫМ ДОМЕ

## АЛЬБО "МАСАВЫХ РЭПРЭСІЙ НЕ БУДЗЕ…"

На выбух 3 ліпеня самай першай з дзяржаўных газет адгукнулася "Советская Белоруссия".

*"Изо дня в день, из года в год оголтелые политики и лакействующие журналисты безжалостно травят толерантное белорусское общество. Без устали, энергично и изобретательно одних белорусов наускивают на других. В особенности молодежь, которую день и ночь призывают к «сопротивлению», зовут «на улицу», развращают «стипендиями» и «грантами», пафосно возводят безмозглое хулиганство в ранг гражданской добродетели (…) Дело, разумеется, не в политических предпочтениях тех или иных группировок. Дело — в детерминированности той части оппозиционной пропаганды, которая в конечном счете неминуемо должна закончиться взрывом! В прямом смысле этого слова (...)*

*Подчеркнем: никаких «массовых репрессий» не будет. Вообще ничего не будет. Кроме целенаправленного поиска преступников. Но покушение на жизнь детей, чья «вина» состояла в том, что они пришли посмотреть концерт, лежит за гранью понимания. Поэтому еще раз хочется сказать всем кукловодам:*

*— Призадумайтесь! Лицемерно восхищаться «мужеством» одурманенных боевиков, бесконечно призывать молодежь к бунту — значит взять на себя моральную ответственность за неминуемые в таких случаях кровавые инциденты. Ружье на стене из первого акта пьесы обязательно стреляет в последнем..."*

Якая аператыўнасць у ацэнках падзеі! Стрэльбу, якая павінна абавязкова стрэліць, на сцяну павесіла, канечне ж, апазіцыя. Толькі незразумела, у якім акце спекталя мы з вамі апынуліся. І галоўнае – хто яго аўтары і рэжысёр-пастаноўшчык?

Масавых рэпрэсій, як у 1937-м, напэўна, мы сапраўды не ўбачым. Але як назваць павальныя допыты іператрусы апазіцыянераў па ўсёй краіне? Упэўнены, што актывісты РНЕ ды іншыя нацыянал-сацыялісты, якія і распальваюць нянавісць у грамадстве, пад падазрэнне ўладаў, як заўсёды, не трапяць.

А "Рэспубліка" напярэдадні 3 ліпеня даведалася, чым ганарацца нашы суайчыннікі. Адказы не ўразілі арыгінальнасцю.

*"Виталий ГРИШАНОВ, председатель Климовичского райисполкома:*

*— Я горжусь тем, что живу в стране, где солдат не посылают воевать в другие государства, где матери могут спокойно дождаться своих сыновей из армии… Не может не вызвать гордости отношение к быту, благоустройству, чистоте вокруг нас. Не мы сами – гости из стран ближнего и дальнего зарубежья отмечают: малые и большие города Беларуси чисты и ухоженны.*

*Виктор КРАМАРЕНКО, архитектор, лауреат Государственной премии, профессор Международной академии архитектуры:*

*— Мне очень отрадно видеть, что Беларусь интегрируется с другими странами. В республику поступают инвестиции и приходят современные технологии. Мы шагаем в ногу со всеми развитыми государствами (...)*

*Сергей КУХТО, ведущий программы «Ваше лото», главный директор главной дирекции телеканала «ЛАД»:*

*— Горжусь Беларусью, ее красавицами девушками и женщинами. Краше, наверное, нет нигде в мире! Вообще, у нас очень красивые люди: и внешне, и внутренне. Много где был, многое видел, но такого радушия, добросердечия, идущей от сердца теплоты не встречал нигде. Мы уникальная нация! Чтобы праздник пришел в каждый дом, 3 июля мы, телевизионщики, будем на работе. Встретимся в эфире!"*



**ГАЙКІ**, *якія лекары дасталі з ранаў пацярпелых ад выбуху. Мінск, 4 ліпеня 2008 году.*

Ну, і сустрэліся. Толькі замест свята ў дамы многіх менчукоў уначы 4–га ліпеня прыйшлі боль і страх. А "ўнутрана прыгожыя людзі", што прысутнічалі ў тую ноч на ўрадавым канцэрце, наступным днём з энтузіязмам ламануліся на масавае відовішча на "Лініі Сталіна". Каб палюбавацца знешне прыгожымі і мужнымі байцамі спецназа, якія, калі што, заўсёды нас абароняць.

Сапраўды, мы ўнікальная нацыя!

**АЛЕСЬ КАНЮЦІЧ**

Радыёхвалі

# СПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА…

## АЛЬБО ЯКІ КОЛЕР У НАЦЫІ?

З асалодай слухаў на Радыё Свабода апошнюю перадачу Міхася Скоблы "Вольная студыя". Госцем перадачы быў шаноўны гісторык літаратуры Вячаслаў Чамярыцкі. Гаворка ішла пра даўнюю загадку, якая трывожыць сэрцы і розумы многіх людзей. Хто ж аўтар "Слова пра паход Ігаравы"? Нагодай для гутаркі стаў выхад кнігі гісторыка Зіміна, дзе ён цвердзіць, што аўтарам Слова быў ураджэнец Беларусі. Вядучаму перадачы надта спадабалася гэтая версія, ён уважліва праштудыяваў кнігу Зіміна, а спадар Чамярыцкі быў з гэтай версіяй не згодны. Але галоўнае: мне, як слухачу, было цікава чуць, як сутыкаюцца розныя логікі і аргументы. Нарадзіўся азарт перачытаць "Слова пра паход Ігаравы" і самому паспрачацца. Гэтая перадача ні ў якое параўнанне не йдзе з перадачамі калегі Міхася Скоблы Вячаслава Ракіцкага "Беларуская Атлантыда". У тых "Атлантыдах" няма спрэчкі, няма дыскусіі. Зразумела, журналіст не можа быць раўназначным суразмоўцам навукоўцу, але, можа, варта запрашаць некалькіх навукоўцаў, альбо, як у выпадку Скоблы, журналіст павінен з нейкіх іншых крыніцаў прадстаўляць іншую пазіцыю.

У панядзелак на Радыё Рацыя чытаў свой фельетон Віктар Сазонаў, і ў гэтым фельетоне на поўным сур'ёзе прагучала фраза "колер нацыі". Меўся на ўвазе, кажучы па-расейску, "цвет нации". А як жа гэта будзе па-нашаму? Можа быць, эліта, лепшыя людзі, нобелі? А колер нацыі ўсім вядомы – бел-чырвона-белы.

**СЯРЖУК ВІТУШКА**

# ПРАПОРЦЫІ

## “СКАЖЫ ДУРНЮ МАЛІЦЦА...”

Невядомыя энтузіясты расклеілі ў тралейбусах плакацікі: “Алкаголь – вораг чалавецтва!”

Вораг – гэта той, хто нападае і забівае, часцей за ўсё – з-за вугла. Ні разу не давялося бачыць, каб бутэлька гарэлкі або віна гналася за кімсь і гвалтам патрабавала сябе выпіць. Наадварот, здараюцца выпадкі калі бутэлька супраціўляецца – корак захрасае і хоць ты плач!

Вядома, п’янства – гэта зло. Але возьмем які-небудзь іншы занятак, больш высакародны. Ну, скажам, чытанне твораў Купалы і Коласа. Што б вы сказалі пра ягамосця, які б закінуў усе справы на карысць гэткага чытання? А ўсе грошы траціў на чарговыя выданні нашых пракокаў?

Не думаю, што жонка такога чалавека была б нашмат больш шчаслівай, чым жонка п’яніцы.

Алкагалізм – вострае запаленне эгаізму. Абы мне было добра, а вы ўсе як хочаце. Не ў вадкасці справа, а ў чалавеку. Хоць ніколі пры гарбаце размова не будзе такой, як пры добрай чарцы. Уся праблема ў прапорцыях. Як у любой справе ці страве. Хто ж будзе глытаць прыправы лыжкамі?

Нядаўна я, урэшце, далучыўся да ліку “інтэрнаўтаў”. “Усё! – прарочылі сябры, – прапаў ты, браце, зацягне й цябе гэта павуціна!” Не зацягнула. Наадварот, у мяне ўражанне, што я займеў новага сябра, які дапамагае мне жыць. Вядома, само сабой лезе адтуль markaзнае смецце, але шчоўкнуў “мышкай” – і чыста.

Калі хтось нясе з лесу не баравікі з лісічкамі, а паганкі з мухаморамі, то ці ж лес вінаваты?

Няма на свеце такой справы, нават найлепшай, якую нельга было б загубіць дыспрапорцыяй. “Скажы дурню маліцца...”

Мала было ў Польшчы ў 1960-я гады спявачак, больш папулярных за Віялету Вілляс. І не толькі на сваёй радзіме, а і за акіянам карысталася поспехам. Не дзіва – голас быў што трэба. Тады “пад фанеру” рот ніхто не разяўляў! Але мела яна яшчэ й добрае сэрца. Шкада ёй было, як і кожнаму нармальнаму чалавеку, бяздомных сабак. Аднаго прыгрэла, другога, трэцяга... А паколькі, вярнуўшыся з Амерыкі, мела сякі-такі капітал, набыла старую ферму і стала збіраць туды пакінутых гаспадарамі жывёл. Адну сотню, другую, трэцюю... А сабакі як сабакі – грызуцца міжсобку, гвалт стаіць, суседзі скардзяцца. А добрая цёця не звяртае ўвагі – харч купляе цэлымі грузавікамі, сама корміць-поіць. Не да спеваў болей. І што тут скажаш?..

У многіх з нас алергія на слова “сацыялізм” – пустыя вітрыны, марныя заробкі, шэрае існаванне. Але ж вось у многіх краінах Захаду, дзе кіруюць сацыял-дэмакраты, сацыялізм у якасці “прыправы” зусім не папсаваў жыцця. Хто б не хацеў жыць, як шведы?

Хоць для асобаў нешараговых і тая “ўраўнілаўка” была пакутлівай. Абдзіралі “прагрэсіўным” падаткам, як ліпку, і “АББУ”, і Бергмана. А ганарар за адну з кніг Астрыд Ліндгрэн абклалі такім падаткам, што пісьменніца яшчэ й сама мусіла даплаціць!

Прапарцыянальнасць – падстава ўсякай гармоніі. Але як і чым, якім інструментам яе вымераць? Ці ж можна ўсур’ёз ставіцца да выбараў розных “Міс універсум”? Як можна вызначыць, якая дзяўчына самая-самая прыгожая?

Я, дарэчы, амаль заўсёды ўгадваю, хто пераможа. Гэта бывае тая, што мне найменш падабаецца...

І што мне рабіць з маім вясковым розумам?

**АЛЕГ АБЛАЖЭЙ**

## Стрэмкі



**БЕЗ ПОДПІСУ**. *Фота з архіву.*

## Фотафакт



**СПЕЦНАЗАВЕЦ** *дэманструе сваё баявое майстэрства падчас рэпетыцыі вайскова-спартовага свята ў гісторыка-культурным комплексе «Лінія Сталіна» пад Мінскам. 4 ліпеня 2008 году.*

# ХТО Ў “ЧОРНЫМ СПІСЕ”?

## ПРАБЛЕМА КАРУПЦЫІ НА ДЗЯРЖАЎНЫМ УЗРОЎНІ ХВАЛЮЕ МНОГІХ

На старонках нашай газеты мы задаваліся пытаннямі: ці магчымыя звышдаходы чыноўнікаў Беларусі і ці ёсць у нас мафія?Выглядае, што праблема карупцыі на дзяржаўным узроўні хвалюе многіх. Пра гэта сведчаць і матэрыялы блогераў у беларускім інтэрнэце. Адзін з іх, пад нікам (інтэрнэт-мянушкай) thorindwarf прапанаваў стварыць “чорны спіс” кампаніяў і вытворцаў, якія маюць дачыненне, на думку наведнікаў інтэрнэту, да беларускай “мафіі”, шчыльна звязанай з кіраўнічым кланам. Паводле апытання, самастойна праведзенага аўтарам прапановы, атрымаўся такі спіс.

1) Marko – абутковы брэнд (трымальнік Мікалай Мартынаў непасрэднага дачынення да “Сям’і” не мае — гэты пункт пад пытаннем);
2) Сетка заправак Лукойл (трымальнік сп. Паўлічэнка);
3) Канцэрн “Трайпл”— газаваныя воды, ваконныя сістэмы (трымальнік Юры Чыж — бізнесмен, набліжаны да “Сям’і”);
4) Асацыяцыя “Честь” — маршрутныя таксі (трымальнік генерал Сівакоў);
5) Супер (Ваша) Лато — трымальнік Пяткевіч (былы муж Наталлі Пяткевіч – **рэд.**);
6) Брэнд “Дарыда” — трымальнік згаданы Юры Чыж;
7) Салон керамічнай пліткі “Лантрэ” — трымальнік нехта з супрацоўнікаў КДБ;
8) Гнуткі гонт “Андулін” — трымальнік дакладна невядомы;
9) Закусачная “Лідо” (трымальнік Кіраўніцтва справамі прэзідэнта).

Аўтар удакладняе, што спіс гэты папярэдні, яго можна абмяркоўваць і дапаўняць. І далей ён піша: “У нас ва ўсіх ёсць браты, сёстры, бабулі і дзядулі, яны ўсе ходзяць у крамы, ездзяць на машынах, будуюць жыллё – падумайце пра гэта, калі наступным разам пацягнецеся за бутэлечкай газіроўкі, ці будзеце вырашаць, на якую калонку паехаць запраўіцца. Амаль ніхто з нашых сваякоў не выходзіць з намі на вуліцу, але большасць з іх ціха ненавідзіць існы стан рэчаў. Прапануйце ім альтэрнатыву банальнаму падстаўлянню галоваў пад дубінкі.




**WWW.SPELLMEDIA.NET.**

Аўтар прызнаецца, што ідэя байкоту названых брэндаў, магчыма, не самая ўдалая, але яна, паводле яго словаў, выклікала жывы водгук сярод наведнікаў інтэрнэту.

А што думаеце вы, нашы чытачы? Пішыце нам, прысылайце СМС, прапануйце свае ідэі.

## ЧЫМ БЕЛАРУСЫ МОГУЦЬ ГАНАРЫЦЦА Ў СВАЁЙ КРАІНЕ? ВАШЫ АДКАЗЫ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ

КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ “СВАБОДУ” ПРАЗ ПОШТУ, ДАШЛІЦЕ ВАШ ПОЎНЫ І ДАКЛАДНЫ АДРАС (ВУЛІЦА, ДОМ І КВАТЭРА, ІНДЭКС, ГОРАД, РАЁН, ВОБЛАСЦЬ) SMS-ПАВЕДАМЛЕННЕМ НА НУМАР +370 687 42185 АЛЬБО НА E-MAIL: EDIT@VILNIA.COM.
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ ЧЫТАЦЬ “СВАБОДУ” Ў ІНТЭРНЭЦЕ І Ў PDF-ВЕРСІІ, ЗАХОДЗЬЦЕ НА САЙТ WWW.SVABODABY.NET.
КАЛІ ВЫ ХОЧАЦЕ АТРЫМЛІВАЦЬ PDF-ВЕРСІЮ “СВАБОДЫ”, ПАВЕДАМЦЕ НАМ НА E-MAIL EDIT@VILNIA.COM ВАШ ЭЛЕКТРОННЫ АДРАС.

ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ! КАБ ГАЗЕТА “СВАБОДА” ПРЫХОДЗІЛА ДА ВАС РЭГУЛЯРНА І ДОБРЫМ ДРУКАМ, РЭДАКЦЫІ ПАТРАБУЕЦЦА ВАША ПАДТРЫМКА. НАКІРОЎВАЙЦЕ, КАЛІ ЛАСКА, ВАШЫ АХВЯРАВАННІ ЗВЫЧАЙНЫМ ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДАМ НА АДРАС:
PAVEL SAVČENKO, SMĖLIO 23-26, LT-10323 VILNIUS-55, LITHUANIA.

**Заснавальнік** ТАА “Тут і цяпер” **Адрас** г. Мінск, вул. Касцюшкі, 18
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў **Падпісана ў друк** 00:24 10.07.08
Тыраж 299 экзэмпляраў